# ФИЛОЛОГИЯ

УДК 008:811.161.3

**В. А. Кузьміч**, дацэнт (БДТУ)

## ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД ДА НАВУЧАННЯ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў СІСТЭМЕ ІДЭАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Канцэпцыя моўнай адукацыі істотна змяняе падыходы да выкладання роднай мовы ў вышэйшай школе. Згодна з новымі патрабаваннямі студэнт павінен валодаць мовай як сістэмай захавання і перадачы духоўна-маральных каштоўнасцей нацыі. Найпаўней ідэалагічная і выхаваўчая функцыі моўных дысцыплін рэалізуюцца пры лінгвакультуразнаўчым падыходзе. У публікацыі разглядаецца вопыт вучэбна-метадычнага забеспячэння моўных дысцыплін у гэтым напрамку на кафедры беларускай мовы БДТУ.

Conception of linguistic education significantly changes approaches to teaching native language in high school. According to new requirements student should know how to use language to keep and translate intellectual and moral wealth of nation. Such a ideological and educational function of linguistic subjects is being fully realized by the means of linguocultural approach. The paper analyzes experience in Belarusian language department of BSTU in this field, including new textbook developed on basis of linguocultural approach.

**Уводзіны.** Сістэма ідэалагічнага выхавання моладзі накіравана на разуменне сутнасці беларускай дзяржаўнасці, якая непасрэдна звязана з паняццямі грамадзянскасці і патрыятызму – найважнейшых духоўных і сацыяльных каштоўнасцей. Менавіта яны маюць прыярытэтнае значэнне для Беларусі як суверэннай дзяржавы, яе сучаснасці і будучыні. Развіццё грамадства перш за ўсё звязана з духоўна-культурным развіццём нацыі, што бясспрэчна з'яўляецца неабходнай умовай роскввіту кожнай краіны і будаўніцтва цывілізаваных зносін з іншымі краінамі.

**Асноўная частка.** Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь неаднаразова падкрэсліваў, што ідэалогія беларускай дзяржавы грунтуецца на любові да сваёй зямлі, павазе да людзей і гонары за сваю дзяржаву. Гэта і ёсць ідэалогія патрыятызму. А вытокі яе ў гістарычнай памяці народа, якая захоўвае нашу мараль, наш лад жыцця, традыцыі, светабачанне. У гэтым наш духоўны гарт, маральная аснова, той вялікі скарб, перададзены нам нашымі продкамі, пакінуты нам, нашчадкам.

Зыходзячы з Канцэпцыі моўнай адукацыі, накіраванай адпаведна і на выхаванне моўнай асобы, істотна змяніліся падыходы да ролі мовы і яе ўсведамлення як формы існавання духоўнай культуры народа. Сённяшні выпускнік школ, а затым і вышэйшых навучальных устаноў павінен быць паўнацэннай моўнай і маўленчай асобай, гэта значыць чалавекам, «які ў любой сітуацыі можа карыстацца мовай як інфарматыўным, інтэрактыўным і перцэптыўным сродкамі ва ўсіх сферах жыццядзейнасці – пазнавальнай, навучальнай, нацыянальна-культурнай, бытавой».

Улічваючы тое, што «задача моўнай адукацыі – дапамагчы чалавеку спазнаць сябе праз культуру, сфарміраваць уласнае культурнае аблічча», неабходна істотна мадэрнізаваць выкладанне беларускай мовы ў вышэйшых навучальных установах. Выпускнік ВНУ павінен не толькі карыстацца прафесійнай лексікай, але і быць асобай, якая валодае «правіламі маўленчых зносін, умее ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў», валодае мовай як сістэмай захавання і перадачы духоўна-маральных каштоўнасцей нацыі. Праз светапогляд народа, яго гісторыю, філасофію, культуру будучыя спецыялісты пашыраюць веды пра наш край, яго адметнасць, пра наш лад жыцця, характар і менталітэт. Уменне папулярызаваць сваю радзіму за мяжой і годна прадстаўляць яе на сусветнай арэне закладваецца менавіта на роднай зямлі праз грунтоўнае ўсведамленне гісторыка-краязнаўчай адметнасці свайго краю. Не апошнюю ролю гэта адыгрывае і ў захаванні эканамічнай стабільнасці краіны.

Для таго каб спалучыць шматгранныя задачы ідэалагічнага выхавання са змястоўным напаўненнем гуманітарных дысцыплін у ВНУ, неабходны цэласны і паслядоўны падыход. На сённяшні дзень такія магчымасці дае лінгвакультуралагічны, які з'яўляецца новым напрамкам у сучаснай лінгваметодыцы (поруч з традыцыйнымі сістэмна-функцыянальным і камунікатыўна-дзейнасным). Менавіта ён фарміруе лінгвакуль-

туралагічную кампетэнцыю, якая прадугледжвае паглыбленне нацыянальна-культурных звестак, адпаведнае выхаванне «чалавека ў культуры» і «чалавека культуры».

Тэрмін «лінгвакультуралагічная кампетэнцыя» яшчэ не замацаваўся канчаткова, і ў навукова-метадычнай літаратуры можна сустрэць розныя абазначэнні гэтай кампетэнцыі: культуразнаўчая, сацыякультурная, этнакультурная. Пры такім падыходзе неабходна навучыцца ўспрымаць мову не як чыстую граматычную схему, а як сабраную за вякі скарбніцу філасофіі, гісторыі, духоўнай культуры народа ў цэлым. Мова адыгрывае важнейшую ролю не толькі ў фарміраванні свядомасці студэнцтва і моладзі, але і ў інтэграцыі яе ў культуру. Сутнасць гэтай кампетэнцыі – у пазнанні праз мову сваёй нацыянальнай культуры, разуменні адметнасці іншых культур, іх узаемасувязі з беларускай. Пры наяўнасці такой кампетэнцыі асоба авалодвае культурным багаццем нацыі, асэнсоўвае мову як элемент духоўнай культуры беларускага народа і яго менталітэту. Лінгвакультуразнаўчая кампетэнцыя прадугледжвае ўсведамленне мовы як праявы духоўнай культуры народа, авалоданне нацыянальна-маркіраванымі адзінкамі мовы, засваенне нацыянальна-адметных этыкетных маўленчых норм культуры маўлення ў цэлым.

Мэта лінгвакультуралагічнага падыходу – каардынацыя ўсіх узроўняў валодання мовай на далучэнне студэнтаў да нацыянальнай і сусветнай культуры, вырашэнне новай інтэграванай задачы, духоўна-маральнага, эстэтычнага, грамадзянскага выхавання на аснове ўзаемадзеяння мовы, літаратуры, культуры, што садзейнічае далучэнню студэнтаў не толькі да нацыянальнай, але і сусветнай культуры.

У задачы лінгвакультуралагічнага падыходу ўваходзяць:

– авалоданне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыяй, якая скіравана на паглыбленне нацыянальна-культуразнаўчых звестак дзеля выкарыстання іх у працэсе маўленчых зносін;

– забеспячэнне свабоднага фарміравання пазнавальнай, маральнай, грамадзянскай культуры студэнтаў;

– забеспячэнне актыўнага ўдзелу ў грамадзянскім жыцці краіны.

Для вырашэння названых задач і развіцця паўнацэннай маўленчай асобы студэнта неабходна фарміраваць лінгвакультуралагічныя веды, уменні і якасці.

Лінгвакультуралагічныя веды – гэта абагульнены вопыт, адлюстраваны ў моўнай свядомасці (на лексіка-семантычным, фразеалагічным узроўнях; у мастацкіх і краязнаўчых тэкстах). Да такіх ведаў адносяць веданне гісторыі краіны, сваёй малой радзімы, традыцый і звычаяў народа, асаблівасцей мясцовых гаворак і быту людзей.

Лінгвакультуралагічныя ўменні – гэта здольнасць студэнтаў выкарыстоўваць здабытыя ім тэарэтычныя веды і адпаведныя навыкі, напрыклад, уменне аналізаваць лінгвакультуралагічную інфармацыю, змешчаную ў тэксце, і творча выкарыстоўваць яе.

Лінгвакультуралагічныя якасці студэнтаў заключаюцца ва ўменні ўспрымаць факты і з'явы культуры, быць стваральнікам і захавальнікам культурнай спадчыны свайго народа для будучых пакаленняў.

Дасягненне такіх мэт і задач патрабуе грунтоўнага вучэбна-метадычнага забеспячэння курсаў «Беларуская мова» і «Сучасная беларуская мова». Для ўкаранення лінгвакультуралагічнага падыходу ў навучальны працэс створаны падручнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, якія не толькі паглыбляюць і пашыраюць веды па прадмеце, але і ўдасканальваюць культуру маўлення, прывіваюць любоў і павагу да свайго народа як стваральніка нацыянальных каштоўнасцей.

На аснове лінгвакультуразнаўчага падыходу дацэнтам кафедры Кузьміч В. А. і старшым выкладчыкам Міксюк Р. В. падрыхтаваны вучэбна-метадычны дапаможнік з грыфам ВМА «Сучасная беларуская мова. Практыкум (для спецыяльнасці «Выдавецкая справа»). У дапаможнік уключаны тэксты для фарміравання лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі, да якіх падабраны адпаведныя заданні па ўсіх тэмах навучальнай дысцыпліны. Тэматычнае напаўненне дапаможніка спрыяе выхаванню патрыятычнай асобы, сапраўднага прафесіянала ў галіне выдавецкай дзейнасці. Такія тэмы, як «Мова – душа народа», «Помнікі беларускага пісьменства», «Беларускае кнігадрукаванне», «Славутыя беларускія навукоўцы», «Выдавецкая справа ў Беларусі», «Народ і яго мудрасць», «Галоўныя сімвалы дзяржавы», «Беларуская тапаніміка і анамастыка», «Беларусь на карце свету», «Этнаграфія Беларусі», «Нацыянальныя супольнасці Беларусі», «Нацыянальны характар і менталітэт. Маўленчы этыкет беларусаў», «Музычная культура Беларусі», «Беларускі тэатр», «Беларускае мастацкая культура», «Беларуская літаратура», «Мастацкае афармленне кнігі», «Гераічная Беларусь» – дазваляюць не проста актыўна пазнаваць свой край, усё гэта дае пачатак індывідуальнай творчай працы студэнтаў, якая далей увасабляецца ў напісанні навуковых даследаванняў, краязнаўчых нарысаў, навуковых прац патрыятычнага зместу і ідэалагічнай накіраванасці. Тэксты сацыя- і этнакультурнага зместу, а таксама па гісторыі, культуры, мас-

тацкай літаратуры, тэксты героіка-патрыятычнай скіраванасці, падабраныя на падставе самых разнастайных сучасных крыніц, красамоўна сведчаць, што ідэі патрыятызму і грамадзянскасці закладзены ў глыбінях нацыянальнай культуры і жывяць яе.

Лінгвакультуралагічныя веды пашыраюцца і замацоўваюцца ў падручніку з дапамогай шматлікіх заданняў, якія патрабуюць індывідуальнай пошукавай працы студэнтаў, творчай перапрацоўкі атрыманай інфармацыі, а не толькі пасіўнага засваення пэўнага аб'ёму ведаў. Гэтаму служаць заданні крэатыўнага характару, як, напрыклад, літаратурна-моўныя віктарыны, сачыненні-разважанні на патрыятычную тэматыку; рэфератыўны пераклад тэкстаў; падрыхтоўка паведамленняў на лінгвістычную і маральна-этычную тэматыку; напісанне творчых эсэ і інш.

Усебакова прадстаўлена тэма подзвігу беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Яна асвятляецца ў такіх заданнях, як складанне тэматычнага радаводу (напрыклад, «Вайна праз лёс маёй сям'і»; «Сям'і маёй пачатак», «Мае карані»), напісанне эсэ «Дзеці і вайна», падрыхтоўка паведамлення пра ўшанаванне памяці пра Вялікую Айчынную вайну на малой радзіме студэнтаў; правядзенне творчага даследавання на тэму «Дзеці вайны ўспамінаюць»; паведамленні пра творы беларускай літаратуры, якія адлюстроўваюць змаганне нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Вынікі самастойнай працы студэнтаў у гэтым напрамку падсумоўваюцца на тэматычнай канферэнцыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне» і прэзентуюцца ў студэнцкіх групах.

Заданні і змястоўнае напаўненне дапаможніка падабраны такім чынам, каб стымуляваць студэнтаў да працягу творчай і навуковай працы, якая вялася на занятках. Такім чынам забяспечваецца непарыўнасць адукацыі і самаадукацыі, а таксама іх сувязь з выхаваннем патрыятызму і грамадзянскасці.

Далучаючыся да здабыткаў сусветнай і нацыянальнай культуры, студэнты атрымліваюць краіназнаўчыя звесткі, неабходныя для адэкватнай камунікацыі. Паглыбляюцца так званыя міжпрадметныя сувязі з такімі дысцыплінамі, як «Краіназнаўства і краязнаўства», «Гісторыя Беларусі» і інш. Апрача таго, развіваецца здольнасць самастойна сінтэзаваць інфармацыйныя рэсурсы праз напісанне навуковых і творчых прац, даследаванняў, твораў іншых жанраў, якія заўсёды запатрабаваны падчас правядзення конкурсаў, выстаў розных узроўняў. У рэчышчы лінгвакультуразнаўчага падыходу кафедрай беларускай мовы за апошнія 5 гадоў праведзена 30 студэнцкіх канферэнцый, 16 універсітэцкіх выстаў па актуальных тэмах ідэалагічнага выхавання. Актыўна працуе студэнцкае аб'яднанне «Пошук», у склад якога ўвайшлі гурткі патрыятычнай накіраванасці. Вынікам дзейнасці аб'яднання з'яўляецца штогадовы ўдзел студэнцкай моладзі ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах і выставах. За апошнія 5 гадоў студэнцкім аб'яднаннем прадстаўлена на рэспубліканскія і міжнародныя конкурсы 219 навуковых і творчых работ, з якіх 93 адзначаны катэгорыямі, граматамі, спецыяльнымі прызамі, падзякамі і каштоўнымі падарункамі. Тэматыка прац, прадстаўленых на рэспубліканскія конкурсы, адпавядае наступным галоўным напрамкам рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу: 1) засваенню вучнямі нацыянальна-маркіраваных адзінак беларускай мовы; 2) спасціжэнню каштоўнасцей і рэалій нацыянальнай культуры; 3) навучанню беларускай мове ў дыялогу культур (напрыклад, «Тапаніміка Гродзеншчыны ў калейдаскопе часу», «Тапонімы Магілёўшчыны ў легендах і паданнях», «Выхаваўчы патэнцыял беларускай народнай педагогікі», «Гісторыка-этнаграфічнае даследаванне паходжання мястэчка Крулеўшчына», «Анамастычныя назвы Чашніцкага раёна ў міфалагічным і рэлігійным аспектах», «Вёска Свіслач: гісторыка-краязнаўчы нарыс ад заснавання да пачатку XX стагоддзя», «Рагачоў гераічны: турыстычны і краязнаўчы маршрут», «Вёска Ленін: гераічныя і трагічныя старонкі», «Пастаўшчына ў скарбніцы беларускай культуры», «Гістарычныя постаці Піншчыны», «Традыцыі народнага выхавання на Полаччыне», «Назвы зямлі салігорскай», «Летапіс роднага краю: невядомыя старонкі гісторыі вёскі Астрошыцы Лагойскага раёна», «Сям'я ў мінулым і сучасным: сацыяльны аспект», «Палескае вяселле» і інш.

**Заключэнне.** Такім чынам, усведамленне самакаштоўнасці і ўнікальнасці культуры кожнага народа, у тым ліку арыгінальнай і шматвяковай культуры беларускага народа, разуменне грамадскага значэння гуманітарных ведаў як часткі агульначалавечай культуры забяспечваюць усведамленне студэнтамі мовы як феномена культуры. Вопыт практычнай рэалізацыі лінгвакультуралагічнага падыходу ў навучанні і выхаванні даказвае слушнасць вядомага выслоўя «Да чалавецтва праз свой народ».

*Паступіла 30.05.2011*